Вячаслаў Швед

# Міжнародная навуковая канферэнцыя "Францішак Скарына і традыцыі беларускай асветы", Варшава, 18 лістапада 2016 г.

Przegląd Środkowo-Wschodni 2, 315-317

2017

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

Przegląd Środkowo-Wschodni, 2, 2017
ISSN 2543-618X

**Вячаслаў Швед**
Uniwersytet Warszawski
Cronon56@gmail.com

# Міжнародная навуковая канферэнцыя *Францішак Скарына і традыцыі беларускай асветы*

Варшава, 18 лістапада 2016 г.

У 1517 г. у Празе бацька беларускай пісьменнасці, гуманіст і друкар Францішак Скарына выдаў у асабістым перакладзе адну з кніг Старога Тэстамента – псалтыр. А таму ў наступным годзе будзе адзначацца 500- годдзе беларускага друку, асветніцтва і будзе нагода яшчэ раз успомніць пра вялікага чалавека. II канферэнцыя Цэнтра Беларускіх Студый (ЦБС) пры Цэнтр па даследаваннях Усходняй Еўропы Варшаўскага ўніверсітэта, якая прайшла 18 лістапада 2016 г. пад назвай "Францішак Скарына і традыцыі беларускай асветы", была, відаць, першай у чарзе юбілейных канферэнцый.

З зацікаўленасцю слухалі ўдзельнікі канферэнцыі запрошаных мінскіх гасцей – кандыдата філасоўскіх навук Алеся Жлутку і кандыдата культуралогіі, намесніка дырэктара НББ Алеся Сушу. Першы раскрыў "Дацкі след у біяграфіі Францішка Скарыны", а другі прадставіў "Спадчыну Скарыны ў свеце: час збіраць камяні". Аказваецца, што з 520 асобнікаў скарынаўскай спадчыны ў Беларусі знаходзяцца толькі 10 (5 з іх – у Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь). Астатнія трэба шукаць у Расіі, Украіне і Германіі.

Ад Кафедры міжкультурных даследаванняў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Факультэта прыкладной лінгвістыкі Варшаўскага ўніверсітэта выступілі прафесар, доктар гістарычных навук Вячаслаў Швед і др габ. Юры Грыбоўскі. Швед распавёў пра гродзенскую каралеўскую друкарню і яе выданні ў 1775–1795 гг., успомніўшы А. Тызенгаўза, М. Пачобута-Адляніцкага (як друкара), кіраўнікоў друкарні і яе прадукцыю (газеты, гаспадарскі каляндар і мастацкія кнігі). Грыбоўскі ў дакладзе "Беларуская культурніцка-асветніцкая дзейнасць у Генеральнай крузе Латвія (1941–1944 гг.)" асвятліў праблемы звязаныя з малавядомымі старонкамі з гісторыі беларусаў Латвіі падчас нямецка-фашысцкай акупацыі.

Большасць выступоўцаў прадстаўляла Цэнтр беларускіх студый. "Сацыя-культурную прастору Полацка, канец 15 – сярэдзіна 16 ст." апісаў з паказам слайдаў Генадзь Семянчук. Усе шукалі "дзе гэтая вуліца, дзе гэты дом", у якім жылі Скарыны, а потым разам з доктарам гістарычных навук Святланай Куль-Сяльверставай займаліся "Лічэннем часу ў эпоху Скарыны". Як заўсёды арыгінальна выступіў па тэме "Міфалагізацыя Скарыны ў беларускім нацыянальным і афіцыёзным гісторыяпісанні" кандыдат гістарычных навук Генадзь Сагановіч. З ім падыскутавалі пра стварэнне міфаў і легендаў у айчыннай гісторыі на розных этапах жыцця грамадства.

Са сваёй любімай праблемай выступіла кандыдат гістарычных навук Інна Соркіна – "Навучальныя ўстановы ў мястэчках Беларусі ў паўсядзённым жыцці іх жыхароў (канец XVIII – пачатак XX ст.". Паказаныя слайды паглыбілі веды прысутных па названай тэме. Кандыдат гістарычных навук Сяргей Токць прадставіў "Беларускамоўную кнігу для сялянства ў XIX – пачатку XX ст.". Два наступных даклады былі з аднаго часовага перыяду: доктар гістарычных навук Алесь Смалянчук пазнаёміў з "Пытаннямі асветы і адукацыі ў дзейнасці Беларускага Нацыянальнага камітэту (сакавік – ліпень 1917 г.)", а Андрэй Чарнякевіч гаварыў пра выдавецкую дзейнасць БНР. Апошнія два даклады былі прысвечаны наступным пытанням:

“Удзел беларускай дзяржавы ў кнігадруку на польскай мове і польскім школьніцтве ў Беларусі” (кандыдат гіст. навук Тадэвуш Гавін) і “Біблія ў штодзённым жыцці евангельскіх хрысціян-баптыстаў у БССР” (магістр Таццяна Касатая).

Мадэратарамі канфрэнцыі былі доктар гістарычных навук кіраўнік ЦБС Алесь Краўцэвіч і Сяргей Токць. Удзельнікі канферэнцыі адзначылі добрую якасць прадстаўленых рэфератаў і іх тэматыку, якая хаця храналагічна ахапіла час ад сярэднявечча да сёняшняга дня, але лагічна была звязана паміж сабой. Прысутнічаючыя выкладчыкі і студэнты ВУ актыўна ўдзельнічалі ў дыскусіях. Сябры ЦБС выказвалі погляд аб лепшым узроўні II канферэнцыі Цэнтра Беларускіх Студый у параўнанні з першай, якая, праўда, мела меньш навуковы характар, бо мэтай яе было прадставіць навуковую зацікаўленасць сяброў Цэнтра. Усе, каго зацікавілі прачытаныя рэфераты змогуць даведацца больш пасля іх публікацый у штогадавіку ЦБС.